# СТАТУТ ВКЛ 1588 Г. – ПОМНІК ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА.

*Л.Л. Голубева, БГУ*

У прэамбуле дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца, што яна абапіраецца на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці. Гэта палажэнне Канстытуцыі абавязвае даследчыкаў усебакова і паслядоўна вывучаць гісторыю беларускага народа. Таму звернемся да гістарычных звестак.

Як вядома, Статуты ВКЛ з'яўляюцца помнікамі прававой культуры беларускага народа. Статут ВКЛ 1588 г. па сваёй сутнасці з'яўляецца сапраўднай Канстытуцыяй дзяржавы. У ім замацаваны такія важныя канстытуцыйныя прынцыпы, як суверэнітэт дзяржавы і народа, роўнасць усіх свабодных людзей перад законам, права чалавека на ўласнасць, на ахову яго жыцця, гонару, маёмасці, на судовую абарону і інш.

Усе нормы Статута прасякнуты ідэяй усталявання прававой дзяржавы, у якой дзейнасць усіх дзяржаўных органаў і службовых асоб павінна поўнасцю адпавядаць праву. Абвяшчэнне ідэі прававой дзяржавы ў перыяд феадалізму сведчыла аб узнікненні новай дзяржаўна – прававой тэорыі, якая больш за ўсе выявілася ў нормах канстытуцыйнага права.

У Статуце замацаваны прынцып падзелу ўладаў: заканадаўчая ўлада належала сойму, выканаўчая – вялікаму князю і радзе, судовая – новым, створаным у выніку судовай рэформы, судовым органам. Насуперак акту Люблінскай уніі ў законе быў замацаваны прынцып дзяржаўнага суверэнітэту. Не было ніводнага артыкула, які б мог улічыць суверэнітэт ВКЛ. На практыцы выконваўся артыкул, які забараняў даваць чужаземцам, у тым ліку і палякам, землі, пасады, чыны і званні. ВКЛ і Польшча заставаліся самастойнымі, захавалі свае тэрыторыі, дзяржаўныя апараты, заканадаўства, фінансы і войска. На мяжы паміж ВКЛ і Польшчай, як і раней, спаганялі пошліну. Насельніцтва кожнай дзяржавы мела свой прававы статус. У ВКЛ толькі ўраджэнцы маглі займаць дзяржаўныя і судовыя пасады. Статут абавязваў гасудара захоўваць недатыкальнасць тэрыторыі ВКЛ, вяртаць раней страчаныя землі.

Статут абавязваў службовых асоб, у тым ліку і самога вялікага князя, дзейнічаць у адпаведнасці з законам, абараняць інтарэсы дзяржавы і народа. Менавіта ў XVI ст. не толькі звяртаецца ўвага на адзінства і незалежнасць, але і пачынае акрэсліваццa ўяўленне аб адзіным грамадзянстве, так як пад тэрмінам "Літва" разумелася ўся дзяржава, палітыка – эканамічным цэнтрам якой была Беларусь, а пад назвай "літвін" – яе грамадзянін. Разуменне адзінага грамадзянства пачынае дамінаваць над рэлігійнымі плынямі ў дзяржаве. Шматлікія артыкулы Статута сведчаць аб яго гуманістычнай накіраванасці. Гуманістычная накіраванасць Статута праяўляецца ў тых артыкулах, якія рэгламентуюць становішча жанчыны. У пятым раздзеле гаварыцца аб тым, што жанчына мае права свабодна, па сваёй волі, выходзіць замуж, валодаць маёмасцю. Забараняецца цяжарную жанчыну прысуджаць да смяротнага пакарання. Гуманістычныя ідэі назіраюцца і ў тых артыкулах Статута, якія прадугледжваюць вызваленне ад пакарання непаўналетніх злачынцаў, псіхічна хворых людзей і тых, хто

знаходзіцца ў стане неабходнай абароны. Узрост крымінальнай адказнасці павялічваецца з 14 да 16 гадоў. Шляхціц за забойства простага чалавека мог быць пакараны смерцю.

Згодна з законам гасудару і ўсім дзяржаўным органам прадпісана забяспечваць спакой усіх жыхароў дзяржавы, незалежна ад таго, якога вучэння яны прытрымліваліся ў хрысціянскім веравызнанні. Свабода веравызнання, што існавала на той час на Беларусі, садзейнічала развіццю прагрэсіўных прававых ідэй, носьбітамі якіх былі С. Будны, А. Волан.

Статут быў адным з першых еўрапейскіх законаў, у якім утрымліваліся нормы, накіраваныя на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў. Ён замацаваў парадак карыстання зямельнымі ўгоддзямі, пушчамі, рэкамі, азёрамі, рэгламентаваў пытанні палявання, рыбнай лоўлі, бортніцтва і інш. Пад аховай закона знаходзіліся флора і фауна. Так, за разбурэнне лебядзінага гнязда спаганяўся штраф тры рублі, сакалінага – шэсць рублёў, за ўчыненне пажару ў лясах вінаваты пакрываў за свой кошт усе страты (Статут 1588. Р.Х.).

Статут ВКЛ 1588 г., і наогул, усе тры Статута абагулілі, творча перапрацавалі ў прагрэсіўным накірунку многія канстытуцыйныя палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў. Шматлікія яго палажэнні, асабліва тыя, якія рэгламентавалі суверэнітэт дзяржавы, структуру і дзейнасць новых органаў улады (сойма, павятовых соймікаў), новых судовых органаў, правы свабодных людзей, ахову навальнага асяроддзя шмат у чым апярэдзілі свой час. Менавіта таму Статут 1588 г., з'явіўся узорам кадыфікацыі заканадаўства ў іншых краінах і доўгі час быў дзеючым законам.

Літаратура:


1. Статут ВКЛ 1588: Тэксты. Давед. Камент. /Беларус.Сав.Энцыкл.; Рэдкал.; Ў.П.Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989.
2. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.15 /Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн., 2002.
3. Доўнар Т.І. Помнікі права Беларусі феадальнага перыяду. – Мн., 2001.
4. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.